Источник: "Беларуская думка" - № 4, 2012-04-18

# Турцыя да Беларусі бліжэй, чым здаецца

**З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі спадаром Джэватам Незіхі Азкая мы сустрэліся якраз на Наўруз. І хоць гэтае старажытнае свята не такое папулярнае ў Турцыі, як на Сярэднім Усходзе, тым не менш сустрэча адразу набыла нейкія светлыя і сяброўскія рысы. Ды і нагода для свята ёсць усё роўна – менавіта ў гэтым годзе адзначаецца 20-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Турцыяй. Гэта і была падстава для размовы, якая значна выйшла за межы простага юбілейнага інтэрв'ю.**



Джэват Незіхі АЗКАЯ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь

**– Ваша Правасхадзіцельства, Вы вельмі вопытны дыпламат, ажыццявілі не адну складаную і адказную місію. Але ўсё ж, наколькі я ведаю, раней Вашай спецыялізацыяй былі краіны Блізкага і Сярэдняга Усходу. З якім пачуццём Вы ўспрынялі прызначэнне ў нашу краіну. Увогуле, што ў Турцыі ведаюць пра Беларусь?**

– Я ўспрыняў прызначэнне з радасцю, таму што змагу адкрыць для сябе новую краіну. І ў гэтым прывабны бок прафесіі – увесь час адкрываць для сябе нешта новае. Хоць Беларусь і не была для мяне «тэра інкогніта». Зразумела, як дыпламат я меў пэўныя веды пра вашу краіну і дастатковую інфармацыю. Ведаў гісторыю Беларусі, асабліва пасля стварэння савецкай рэспублікі, пра ролю Беларусі ў СССР. Тыя важныя працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Савецкага Саюза, у суседніх рэгіёнах, цікавілі мяне ўжо даўно.

### НАША ДАСЬЕ

АЗКАЯ Джэват Незіхі.

Нарадзіўся ў 1951 годзе ў г. Анкара. Скончыў каледж у Анкары і Анкарскі ўніверсітэт (факультэт паліталогіі). З 1976 года працуе у Міністэрстве замежных спраў Турэцкай Рэспублікі на розных пасадах. У 1991–1993 гадах быў саветнікам па знешнепалітычных пытаннях пры Кабінеце прэм'ер-міністра, у 1993–2000 гадах працаваў у структурах Еўрапейскага саюза. У 2000 годзе прызначаны паслом, намеснікам Генеральнага дырэктара Упраўлення Паўднёвай Азіі, Далёкага Усходу і краін Ціхаакіянскага басейна. У 2001–2055 гадах – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Амане, у 2005–2006 гадах – Пасол па асаблівых даручэннях, саветнік Міністэрства замежных спраў, у 2009–2011 гадах – Галоўны саветнік прэм'ер-міністра па пытаннях Кіпра.
З 2011 года – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

Трэба дадаць, што я ўвогуле цікаўлюся геаграфіяй, асабліва палітычнай. Пасля таго як стала вядома, што мяне накіроўваюць у Рэспубліку Беларусь паслом, я выкарыстаў інфармацыю, якая ёсць у нас у Міністэрстве замежных спраў, а гэта сапраўды вельмі падрабязныя і поўныя звесткі.

**– Вы дыпламат, пэўныя веды пра амаль любую краіну свету – частка прафесіі. А калі спытаць простага чалавека на вуліцы Анкары, Стамбула, Ізміра ці Дыярбакыра, што ён ведае пра Беларусь?**

– Наўрад ці ён мае якую інфармацыю па гісторыі ці культуры Беларусі. У прынцыпе многія ў нас не бачаць вялікай розніцы паміж Беларуссю і Расіяй. Наша геаграфічнае становішча (а мы таксама знаходзімся ў Еўразіі), дае магчымасць турэцкім грамадзянам глядзець на Расію і Беларусь як на блізкія краіны. Магчыма, я скажу нешта не вельмі прыемнае для вас. Ёсць і пэўны негатыўны імідж Беларусі ў Турцыі. Напрыклад, калі вы запытаецеся ў звычайнага турка, што такое Беларусь, дзе яна знаходзіцца, то вельмі распаўсюджаным адказам будзе поўная асацыяцыя з Расіяй. Яны чуюць «Белая Расія» і ўспрымаюць гэта як нешта агульнае, нават аднолькавае. Але калі я прыехаў сюды, то пабачыў гэтую розніцу. Я ўпэўніўся ў існаванні значных адрозненняў на асабістым вопыце. Гэта было і вынікам маіх рабочых паездак, дзе я сам задаваў пытанні розным людзям, у чым гэтая розніца. Мне даводзілася бываць і ў Расіі, у розных гарадах. І цяпер я магу дакладна сказаць, у чым розніца

паміж Беларуссю і Расіяй. Найперш, Беларусь больш еўрапейская краіна, беларусы вельмі любяць свой край. У пэўным сэнсе – у добрым разуменні гэтага слова – яны нацыяналісты.

Але я вам хачу сказаць, што імідж Турцыі ў Еўропе таксама зусім не такі добры. Тут мы падобныя. Ёсць розныя сродкі пераадолення такой сітуацыі, найперш гэта вандроўкі, калі людзі прыязджаюць у вашу краіну, і вы едзеце ў іншыя. Гэта дапамагае пераадолець прадузятасць. Але найбольш паспяхова гэтую сітуацыю здолеюць выправіць наступныя пакаленні, якія будуць пазбаўлены многіх стэрэатыпаў. Пачынаць жа такую працу трэба цяпер.

**– А з якімі стэрэатыпамі адносна туркаў сутыкнуліся Вы, калі прыехалі ў Беларусь? Ці можаце назваць тры найбольш распаўсюджаныя?**

– А вось тут не было нічога новага. Калі мы параўнаем тыя стэрэатыпы, што існуюць у Беларусі адносна туркаў, то яны будуць амаль аднолькавыя з тымі іміджавымі праблемамі, з якімі мы сутыкаемся ў Заходняй Еўропе. Вельмі часта турэцкую нацыю ўяўляюць як нейкую сярэднеўсходнюю сумесь, але мы адначасова з'яўляемся і жыхарамі Міжземнамор'я. Напрыклад, гэта праяўляецца ў тым, што мы вельмі экспрэсіўныя, адкрытыя. Гэта дэталі, але ж важныя, найперш для чалавечых стасункаў, камунікацыі. Туркі маюць і сваю самаідэнтыфікацыю, якую не губляюць з часам, а, наадварот, вельмі цэняць. Яны даволі хутка асімілююцца, калі трапляюць у такую добрую краіну, як Беларусь. Але, нягледзячы на гэта, яны не страчваюць сваёй этнічнай сутнасці. На мой погляд, адным з фактараў гэтага з'яўляецца яшчэ і рэлігія, бо турэцкая нацыя – кансерватыўная і надае ёй вялікую ўвагу. У гэтым няма нічога новага, гэта тое, што складвалася ў нас стагоддзямі. Таму я думаю, што тут можа ўзнікнуць нейкае непаразуменне з боку іншых немусульманскіх народаў у дачыненні да туркаў. Вы прасілі назваць тры рэчы, але можна назваць і трынаццаць. Галоўнае ў тым, што ў нас вельмі розныя культуры. А таму заўжды будуць існаваць падставы да непаразумення. І ўсё ж нам варта сканцэнтравацца на тым, што мы жывём у глабальным свеце, таму неабходны пэўны інтэрактыў, патрэбна, не звaжаючы на негатыўныя бакі, талерантна іх успрымаць.

**– Цяпер ужо відавочна, што Турцыя пачынае ўсё больш упэўнена адыгрываць новую ролю ў рэгіёне і свеце. Але не ўсе добра разумеюць, якія мэты пры гэтым ставіць Турцыя перад сабой. Наколькі амбіцыёзныя гэтыя мэты? У чым галоўная ідэя гэтай новай ролі ў рэгіёне?**

– Тое, пра што вы кажаце, можна па-рознаму назваць: новая сіла рэгіёна, новы лідар. Але гэта моц, уплыў з'явіліся не знянацку, а сталі вынікам пэўнага гістарычнага працэсу. Нельга казаць, што мы ставілі такую мэту «стаць лідарам рэгіёна», але развіццё нашай краіны прывяло да таго, што мы дасягнулі таго ўплыву, які маем зараз. Ды і што такое гэта лідарства? Турцыя вельмі адрозніваецца ад Ірана, ад арабскіх краін. Я добра знаёмы з сітуацыяй у краінах Усходу. Два гады я пражыў у Лівіі, чатыры гады – у рэгіёне Персідскага заліва. Даводзілася бываць і ў Егіпце, і ў Тунісе. Усе гэтыя арабскія краіны настолькі розныя, што нават мова ў



На 2-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь – Турцыя: шляхі супрацоўніцтва»

іх адрозніваецца. Лівіец не зразумее араба з узбярэжжа Персідскага заліва. А што такое Егіпет? Гэта краіна, якая бярэ свой пачатак ад фараонаў. Уявіце сабе, якая гісторыя, якая традыцыя! Таму я хачу сказаць, што Турцыя не з'яўляецца нейкай ідэальнай мадэллю для якой-небудзь краіны. Мы на гэта не прэтэндуем. Але тыя прынцыпы, на якіх сёння заснавана наша палітыка, напры-

Источник: "Беларуская думка" - № 4, 2012-04-18

клад свецкасць, прываблiваюць многiх. Мы заўжды рады дапамагчы нашым партнёрам рэалiзаваць гэтыя прынцыпы. Вядома, мае ўплыў i спадчына былой Асманскай iмперыi. На працягу 600 гадоў iснавала Pax Osmana. Амаль 400 гадоў не было блiзкаўсходняга канфлiкту. I цяпер, хоць i з iронiяй, але мае арабскiя калегi-дыпламаты гавораць: «Вы, туркi, пайшлi, пакiнулi нас адных, i зараз мы знаходзiмся ў такiм няўпэўненым становiшчы». Магчыма, i звычайныя грамадзяне таксама так лiчаць. Паглядзiце, колькi болю i крывi ў гэтым рэгiёне, напрыклад у Сiрыi. Турцыя не можа ўспрымаць гэта спакойна. Мы не можам адмовiцца ад нашага сумеснага гiстарычнага мiнулага. Я хачу сказаць, што гэтыя краiны ўхваляюць нашы спробы ўступiць у Еўрапейскi саюз, задаволены тым, што мы з'яўляемся 16-й эканомiкай свету. Але яны глядзяць на нас не з зайздрасцю, а з задавальненнем, па-брацку. I ў гэтым сэнсе яны iмкнуцца быць як Турцыя, пераймаць пэўныя элементы нашай мадэлi. Мы ўзаемадзейнiчаем з краiнамi рэгiёна пастаянна, напрыклад, праз Арганiзацыю Iсламскага супрацоўнiцтва.

**– Спадар пасол, калi Вы ўзгадалi Сiрыю, то не магу не задаць i такое пытанне. Нашы краiны даволi сур'ёзна разышлiся ў ацэнцы прычыны i наступстваў арабскiх рэвалюцый, у тым лiку падзей у Сiрыi, якiя працягваюцца дагэтуль. Як вядома, Турцыя рашуча падтрымала рэвалюцыйную хвалю, зараз настойвае на адстаўцы Башара Асада. Беларусь вельмi крытычна ставiцца да таго, што адбываецца ў арабскiх краiнах. У сiрыйскай сiтуацыi наша краiна салiдарызавалася з двума нашымi стратэгiчнымi партнёрамi – Расiяй i Кiтаем. Цi не нанясе такая розніца ў падыходах шкоду нашым адносiнам?**

– Я лiчу, што гэта нi ў якiм разе не паўплывае на нашы далейшыя адносiны. Таму што вельмi важны дыялог i далейшае абмеркаванне ўсiх, у тым лiку складаных, пытанняў. У гэтым i заключаецца функцыя дыпламатаў. Я на дыпламатычнай працы ўжо 40 гадоў. Наша прафесiя адметная тым, што нават пасля таго, як пралiлася кроў, можна сесцi за стол перамоваў, падпiсаць пагадненне, выпiць пасля гэтага шампанскага i выкiнуць зброю. Тут вельмi важна зразумець другi бок, чаму ён прытрымлiваецца пазiцыi, з якой ты не згодны. Асаблiва гэта важна на стадыi перамоваў. Напрыклад, Расiя па-ранейшаму падтрымлiвае рэжым Башара Асада – мы павiнны зразумець i гэ-



Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам. Стамбул, 2010 год

тую пазiцыю. I толькi тады мы прыйдзем да паразумення i агульнага рашэння. Трэба шукаць агульныя пункты гледжання. Я разумею, што i Расiя, i Беларусь, i Кiтай таксама шукаюць урэгулявання сiтуацыi ў Сiрыi, але глядзяць на шлях да мiру па-свойму. Вы бачыце, што ў расiйскага мiнiстра Сяргея Лаўрова ёсць тлумачэннi на гэты конт, нават назiраецца эвалюцыя пазiцыi. Таму я лiчу, што розніца памiж нашымi поглядамi на гэтую праблему не будзе мець нiякага прынцыповага значэння для нашага далейшага супрацоўнiцтва

**– У Беларусi апошнiм часам вельмi напружаныя адносiны з Еўрапейскiм саюзам i Злучанымi Штатамi. Ад'езд паслоў краiн ЕС з Мiнска стаў пiкам эскалацыi дыпламатычнага канфлiкту. Цi магчыма такое, каб Турцыя выступiла пасрэднiкам альбо мадэратарам пры ўрэгуляваннi гэтага канфлiкту?**

– Думаю, што праблема з ад'ездам паслоў у хуткiм часе вырашыцца. Магчыма, ужо да лета цi пасля летнiх дыпламатыч-

Источник: "Беларуская думка" - № 4, 2012-04-18

ных канікул. У любым выпадку, пытанне будзе вырашана. Цяпер трэба думаць аб шматгадовай перспектыве адносін. У мяне асабіста не выклікае сумнення, што Беларусь здолее ўліцца ў інтэграцыйны еўрапейскі працэс. І той саюз, у які ўступіла Беларусь – аб'яднанне Беларусі, Казахстана і Расіі, не будзе гэтаму перашкодай, а наадварот. Напрыклад, калі мы паглядзім на Іспанію, то яна таксама ўваходзіць у саюз з лацінаамерыканскімі дзяржавамі, што не перашкаджае ёй быць і членам ЕС. Тое, што вы падтрымліваеце цесныя і вельмі добрыя стасункі з Расіяй, іншымі постсавецкімі краінамі, толькі ўзмацняе вашы пазіцыі, найперш эканамічныя, для таго каб пазней інтэгравацца ў Еўрасаюз. Мы пастаянна падтрымліваем кантакты з Еўрапейскім саюзам па беларускім пытанні. І наша пазіцыя застаецца нязменнай: памылковым з'яўляецца падыход увядзення нейкіх санкцый. Такім чынам, мы выступаем супраць палітыкі Еўрасаюза ў гэтым пытанні і прынцыпова тут разыходзімся. Трэба адзначыць, што наша пазіцыя знаходзіць у нашых партнёраў разуменне, але яны бачаць сітуацыю па-іншаму. Калі гаварыць пра агульную сітуацыю, якую вы назвалі эскалацыяй, то тут я аптыміст і лічу, што яна павінна ў хуткім часе вырашыцца.

Што да пасрэдніцкай ролі, то такі вопыт у Турцыі ёсць. Але гэта не такое простае пытанне. У любым выпадку функцыю пасрэдніка магчыма выконваць толькі пры жаданні абодвух бакоў.

Ад сябе асабіста скажу, што я вельмі засмучаны развіццём падзей, звязаных з адносінамі паміж ЕС і Беларуссю. Мы вельмі паспяхова супрацоўнічаем з тымі пасламі, што з'ехалі, сумесна вырашаем многія рабочыя пытанні. У нас існуюць і сумесныя праекты, якія мы запланавалі. Таму я вельмі чакаю іх, жадаю, каб паслы не засядзеліся дома, бо наша дыпламатычная сям'я тут, у Беларусі, у пэўным сэнсе асірацела. Калі глядзець на сітуацыю шырэй, не абмяжоўваючыся толькі апошнім дыпламатычным канфліктам, то мы бачым вашу краіну як еўрапейскую. Немагчыма вырваць Беларусь з Еўропы, бо гэта яе неад'емная частка.



**– Але і ў адносінах Турцыі з Еўрасаюзам не так усё добра. Працэс далучэння Вашай краіны да ЕС нагадвае сапраўдную бясконцую палітычную сагу. Дазволю сабе прывесці жарт, які ходзіць у дыпламатычных кулуарах. Адзін палітык пытаецца ў другога: «А калі ж Украіна ўступіць у ЕС?» Той адказвае: «Пасля Турцыі». – «А калі ж Турцыя?» – «А Турцыя ніколі».**

– Так, ёсць і такое меркаванне. Ведаеце, першы раз мы спрабавалі ўступіць у Еўрапейскі саюз у 1959 годзе. У той час мне было 8 гадоў, я быў у другім класе пачатковай школы. Цяпер мне засталося чатыры гады да выхаду на пенсію. І Турцыя ўсё яшчэ намагаецца ўступіць у Еўрапейскі саюз. Тады, калі Турцыя падавала сваю заяву, у Еўрапейскую супольнасць (яна называлася нават па-іншаму) уваходзіла толькі 6 членаў, зараз іх 27. У наш час ужо Сербія, Македонія, Албанія збіраюцца ўступаць у Еўрапейскі саюз. Украіна, канешне, мае вялікую тэрыторыю, што ўяўляе сабой пэўную цяжкасць з далучэннем да ЕС, але з часам яна таксама стане членам саюза. Тое, што ў гэтай краіны, як і ў Турцыі, узнікаюць праблемы з далучэннем да еўрапейскай сям'і, няма нічога дзіўнага. Для ЕС, як і для чалавека, прасцей праглынуць маленькі кавалак.

Еўрапейскі саюз – гэта дэмакратыя, рынычная эканоміка і правы чалавека, каштоўнасці, актуальныя для ўсяго свету. З пункту гледжання эканомікі Турцыя дастаткова добра падрыхтавана для ўступлення ў ЕС, нават лепш, чым некаторыя дзейныя члены гэтай структуры. Наш банкаўскі сектар развіваецца хутчэй, чым у ЕС і нават у Злучаных Штатах. І гэта не мае словы, а экспертаў Міжнароднага валютнага фонду. У палітычнай сферы Еўрапейскі саюз крытыкуе нас, і я хачу сказаць, што яны маюць рацыю. Прайшло ўжо больш за 30 гадоў з моманту ваеннага перавароту ў Турцыі, а мы дагэтуль выпраўляем наступствы тых падзей. Я спадзяюся, што гэтая праца будзе завершана ўжо ў бягучым годзе. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што ў хуткім часе мы будзем мець сучасную канстытуцыю, заснаваную на прынцыпах свабоды.

На самай справе, гэта не так важна, уступіць Турцыя ў ЕС ці не. Давайце паглядзім на такія квітнеючыя краіны, як Нарвегія, якая можа ўступіць у ЕС у любы момант, але не робіць гэтага асэнсавана, бо на дадзены момант ёй такі крок не па-

трэбны. Можна спытаць у швейцарцаў, ці хочуць яны ўступаць у Еўрапейскі саюз. Думаю, што адказ будзе адмоўны, бо на гэтым этапе аўтарытэт Еўрапейскага саюза не такі высокі. Таму, калі вы спытаеце зараз у туркаў, ці хочуць яны ўступаць у ЕС, то большасць маіх суграмадзян адкажа: «Не». У сувязі з апошнімі эканамічнымі праблемамі ў краінах Еўрапейскага саюза яго ўжо ніхто не бачыць як ратаванне. Хоць я не з тых, хто лічыць, што еўра як валюта абрынецца і не будзе існаваць. Наша краіна таксама перажыла вельмі шмат у час гэтага крызісу. У Еўрапейскім саюзе цэнтрам з'яўляюцца Германія і Францыя. Сумесныя дзеянні гэтых дзвюх краін падтрымліваюць мір і баланс у ЕС, у рэгіёне ў цэлым.

**– У час гутаркі мы ўжо некалькі разоў узгадвалі тыя значныя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў Турцыі. Мне не аднойчы даводзілася бываць у розных гарадах Вашай краіны, размаўляць з турэцкімі палітыкамі, бізнесменамі, навукоўцамі і журналістамі, і магу засведчыць, што працэс абнаўлення Турцыі сапраўды ўражвае. Але любое рэфармаванне мае як станоўчы, так і адмоўны бок. Некаторыя параўноўваюць сучасную мадэрнізацыю Турцыі з «перабудовай» у СССР. Ці не баіцеся Вы, што рэформы могуць расхістаць дзяржаўны лад, падарваць тыя асновы, якія заклаў яшчэ Мустафа Кемаль Атацюрк, бацька сучаснай турэцкай нацыі?**

– Найперш я хачу сказаць, што мы не знаходзімся ў такім цяжкім становішчы, як Савецкі Саюз у 80-я гады мінулага стагоддзя. Турцыя з'яўляецца членам Савета Еўропы з моманту стварэння гэтай арганізацыі. Усе спрэчкі па правах чалавека маюць месца, але хутка вырашаюцца. У пасляваенны час, хоць і з пэўнымі перапынкамі, мы жывём у дэмакратычнай краіне. І новая канстытуцыя, пра якую я ўжо гаварыў, і развіццё палітычных партый і грамадскіх арганізацый, і ўсё большыя правы прафсаюзаў – усё гэта сведчанне дэмакратычнага працэсу. Ёсць пэўная занепакоенасць, звязаная з пашырэннем уплыву рэлігіі. Але гэта заўжды вельмі адчувальнае пытанне. Турэцкі народ кансерватыўны і прывязаны да рэлігіі. Разам з тым у нашым побытавым жыцці ўплыў рэлігіі ўсё ж адчуваецца не так моцна, паколькі рэлігія – гэта нешта асабістае. У Турцыі адзначаюцца мусульманскія святы, але выхадныя дні ў нас усё ж субота і нядзеля. Адукацыя поўнасцю свецкая. Кожны бацька можа накіраваць сваё дзіця на курсы па вывучэнні Карана. Тут усё залежыць ад жадання сям'і. У многіх арабскіх краінах у час месяца Рамазан усе рэстараны зачынены, у вялікіх атэлях вешаюць спецыяльныя шторкі, за якімі немусульмане харчуюцца, алкаголь забаронены поўнасцю. У Турцыі такога няма. Мы найперш турыстычная краіна. Хоць у час Рамазана некаторыя рэстараны могуць быць зачынены. Турцыя – вялікая краіна з 75-мільённым насельніцтвам. Мы можам параўнаць яе з вялікім танкерам. Вы не здолееце кіраваць ім так, як нейкай лодкай, бо, каб манеўраваць, вам спатрэбіцца і больш часу, і больш навыкаў.




Найлепшы шлях пазбавіцца стэрэатыпаў пра нашу краіну – гэта прыехаць у Турцыю. Мы нічога не хаваем, ці, наадварот, не выстаўляем толькі станоўчае. Нашы госці могуць заўважыць і нешта негатыўнае, але мы ўпэўнены, што добрых рэчаў, назіранняў будзе значна больш.

**– Кантакты кіраўнікоў дзяржаў, урадаў, вядучых палітыкаў – гэта заўжды добры рухавік для развіцця двухбаковых адносін. Ці можам мы чакаць у хуткім часе нейкіх знакавых візітаў вышэйшага альбо высокага ўзроўню?**

– Мы ўвесь час абменьваемся дэлегацыямі. Я пералічу толькі некаторыя візіты за апошні час. З 11 па 13 сакавіка 2010 года ў Мінску знаходзіўся кіраўнік Цэнтральнага банка Турэцкай Рэспублікі Дурмуш Йылмаз, 14 красавіка 2010 года прыязджаў старшыня Касацыйнага суда Турцыі Хасан Герчкер. У сваю чаргу, з візітам у Турцыі быў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч (5–8 жніўня 2010 года). Дарэчы, тады паміж нашымі краінамі было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне навучання банкаўскага персанала.

Акрамя таго, 8–9 ліпеня 2010 года ў Мінску адбылося пасяджэнне змешанай беларуска-турэцкай транспартнай камісіі, 5–8 кастрычніка 2010 года дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі

наведаў Анкару. У ходзе гэтага візіту было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж нацыянальнымі бібліятэкамі дзвюх краін.

Колькасць двухбаковых візітаў не змяншалася і ў 2011 годзе. Можна прыгадаць, што ў маі 2011 года ў Мінску былі праведзены двухбаковыя палітычныя кансультацыі на ўзроўні міністэрстваў замежных спраў, а ў пачатку чэрвеня 2011 года ў Мінск прыбыла дэлегацыя прадстаўнікоў абароннай прамысловасці Турцыі, якая правяла шэраг важных перамоў.

У лістападзе 2011 года з нагоды правядзення пасяджэння Беларуска-Турэцкай сумеснай міжурадавай эканамічнай камісіі і пасяджэння змешанай беларуска-турэцкай камісіі па турызму Мінск наведаў міністр культуры і турызму Турцыі Эртугрул Гюнай. Падчас сустрэчы міністраў замежных спраў Сяргей Мартынаў і яго калега з турэцкага боку Ахмет Давутаглу прынялі рашэнне, што пасяджэнні змешаных камісій, якія праводзіліся раз у тры гады, будуць праводзіцца штогод. Я лічу, што гэта рашэнне з'яўляецца важным паказчыкам з пункту гледжання дынамікі развіцця двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі. У час пасяджэнняў змешаных камісій былі праведзены і сустрэчы бізнесменаў дзвюх краін, якія таксама падпісалі важныя пагадненні.

Зараз мы дамовіліся пра штогадовыя пасяджэнні міжурадавай эканамічнай камісіі. У хуткім часе ў Беларусі можна чакаць міністра замежных спраў Турцыі. Але вы бачыце, што Турцыя цяпер знаходзіцца ў эпіцэнтры сусветнай палітыкі. Гэта звязана з сітуацыяй у Сірыі, ядзернай праблемай Ірана, урэгуляваннем у Афганістане і іншымі актуальнымі праблемамі. Таму ў нашага міністра вельмі напружаны графік. Пагадненне пра бязвізавы рэжым падрыхтавана ўжо, і мы гатовы да падпісання. Напярэдадні парламенцкіх выбараў, якія пройдуць у Беларусі, напэўна, мы запросім беларускую парламенцкую дэлегацыю ў Турцыю. Запланаваны і візіт спікера нашага парламента ў Беларусь. Мы чакаем яго ў гэтым годзе. Але, магчыма, ён не паспее ў сувязі з канстытуцыйнай рэформай у нашай краіне. Палітычныя кансультацыі праходзяць штогод, у гэтым годзе яны пройдуць у Анкары. Нашай мэтай з'яўляецца прыцягнуць увагу ў Турцыі да Беларусі.

**– Вы сказалі, што пагадненне пра бязвізавы рэжым поўнасцю ўжо гатова. Калі нам чакаць пачатку яго рэалізацыі?**

– Ёсць пэўныя працэдурныя і тэхнічныя пытанні. Гэтае пагадненне павінна быць ухвалена парламентамі дзвюх краін, што зойме пэўны час. Для беларусаў яго ўвядзенне будзе мець больш сімвалічнае значэнне. Вашы грамадзяне ўжо цяпер могуць атрымаць візу непасрэдна ў аэрапорце па прылёце ў Турцыю. Вельмі добра развітая (і гэты працэс працягваецца) турыстычная інфраструктура прыцягнула да сябе ўвагу беларускіх турыстаў: наша краіна стала адным з найбольш папулярных месцаў адпачынку. Апошнім часам штогод каля 150 тысяч беларусаў прылятаюць у Турцыю. Нягледзячы на тое, што гэта колькасць можа здацца невялікай на фоне агульнай колькасці турыстаў – 27–28 мільёнаў чалавек штогод, гэта мае вялікае значэнне з пункту гледжання знаёмства і збліжэння турэцкага і беларускага народаў.



V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Педагагічная адукацыя ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў: метадалогія, тэорыя, практыка»

Турэцкім грамадзянам для атрымання візы даводзіцца ехаць у Анкару, у беларускае пасольства. Вядома таксама, што колькасць турэцкіх турыстаў, што наведваюць Беларусь, невялікая, каля 10–15 тысяч чалавек у год. Тым не менш пагадненне аб скасаванні візавага рэжыму, несумненна, прывядзе да значнага росту колькасці турэцкіх грамадзян, якія прыязджаюць у Беларусь. Не

Источник: "Беларуская думка" - № 4, 2012-04-18

толькі дзякуючы вялікай колькасці снегу, што робіць Беларусь зручным месцам для заняткаў зімовымі відамі спорту, але і дзякуючы выдатным лясным масівам і незлічонай колькасці рэк і азёр, якія чакаюць наведвальнікаў з Турцыі, Беларусь валодае вялікім турыстычным патэнцыялам. Для рэалізацыі гэтага патэнцыялу, як мы бачым, у апошнія гады было зроблена шмат паспяховых захадаў. У краіне, з аднаго боку, развіваецца турыстычная інфраструктура, а з другога – расце колькасць міжнародных авіявылетаў.

Таму мы спадзяёмся, што падпісанне пагаднення прывядзе да значнага росту колькасці турэцкіх грамадзян, што прыязджаюць у Беларусь. Паверце, туркі вельмі прадпрымальныя людзі. Іх актывізацыя тут, у Беларусі, прынясе вялікую карысць. Гэта можа перавярнуць уяўленні пра вядзенне бізнесу. Такія добрыя вынікі мы ўжо бачым у Расіі, з якой у нас існуе бязвізавы рэжым. Нашы бізнесмены пры выбары краіны для інвестыцый, вядзення бізнесу перавагу аддаюць тым краінам, з якімі ў нас існуе бязвізавы рэжым.

**– Не так даўно адкрылася беларускае генконсульства ў Стамбуле. Ці плануецца пашырыць турэцкае пасольства ў Беларусі, магчыма, адкрыць аддзяленні ў рэгіёнах?**

– Такое пытанне мае сэнс. Усё будзе залежаць ад развіцця нашых двухбаковых адносін. Але наша актыўнасць у рэгіёнах можа праяўляцца не толькі ў адкрыцці генконсульстваў ці аддзяленняў пасольства. Ёсць і такая форма, як ганаровыя консулы. Гэтая дыпламатычная форма не вельмі развітая ў Беларусі, магчыма, мы будзем выкарыстоўваць і яе. Але ўсяму свой час. Я наведваю рэгіёны Беларусі і бачу цікавасць да нашай краіны. Амбіцыі туркаў невычэрпныя: у маіх планах арганізаваць авіясувязь паміж Магілёвам, Гомелем, Брэстам і Турцыяй, абнавіць тэрміналы і аэрапорты гэтых гарадоў. Я зараз працую над гэтым пытаннем разам з «Турэцкімі авіялініямі». Спадзяюся, што штодзённымі стануць авіязносіны з Мінскам.

**– Спадар пасол, наша гаворка адбываецца, у тым ліку, і з нагоды 20-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Турцыяй. Якія мерапрыемствы плануюцца ў сувязі з гэтым?**

– Турцыя, дарэчы, стала адной з першых краін, што прызналі незалежнасць Беларусі. Дыпламатычныя адносіны паміж дзяржавамі былі ўсталяваны 25 сакавіка 1992 года. І ў гэтым годзе мы адзначаем іх 20-годдзе. З гэтай нагоды запланаваны розныя мерапрыемствы, пераважна культурныя, якія пройдуць як у Анкары, так і ў Мінску.



У час сустрэчы міжпарламенцкай групы дружбы «Турцыя – Беларусь». 2010 год

Я хацеў бы даць агульную ацэнку развіццю нашых адносін. Мяркую, што за мінулыя дваццаць гадоў, пачынаючы з абвяшчэння незалежнасці Беларусі і да сённяшняга дня, народы нашых краін лепей даведаліся адзін пра аднаго, і тое, што сяброўства і супрацоўніцтва паміж намі хутка развіваюцца, з'яўляецца вялікім дасягненнем. Урады дзвюх краін таксама прыклалі значныя намаганні ў гэтым напрамку, і цягам кароткага перыяду падпісалі і ўвялі ў дзеянне некалькі дзясяткаў двухбаковых пагадненняў. Такім чынам, падрыхтавана неабходная дагаворная база для далейшага развіцця ўзаемаадносін.

Дзякуючы адсутнасці якіх-небудзь палітычных праблем паміж нашымі дзяржавамі, палітычныя ўзаемаадносіны таксама дастаткова добра развіты. У выпадку неабходнасці нашы міністры замежных спраў сустракаюцца адзін з адным, рэгулярна ажыццяўляюцца ўзаемныя візіты міністраў, а таксама палітычныя кансультацыі паміж міністэрствамі.

У гэтым кантэксце візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Турцыю ў 2010 годзе, у ходзе якога адбыліся сустрэчы з Прэзідэнтам Абдулахам Гюлем і прэм'ер-міністрам Рэджэпам Таіпам Эрдаганам, адыграў важную ролю ў далейшым развіцці двухбаковых адносін і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

**– Тое, што паміж выканаўчымі органамі ўлады ўсталявалася ўзаемаразуменне, добра. Аднак у сучасных міжнародных сувязях вялікая роля адводзіцца і парламенцкім кантактам. Ці ёсць дасягненні ў гэтым напрамку?**

– Безумоўна. Парламенты Беларусі і Турцыі таксама вельмі годна выконваюць свае функцыі дзеля ўмацавання сяброўства паміж народамі і аказання падтрымкі міжурадавым сувязям. Створаныя на базе парламентаў абедзвюх краін групы дружбы ў ходзе двухбаковых візітаў атрымалі магчымасць абмяняцца думкамі па розных пытаннях і ўсталяваць супрацоўніцтва, нарэшце, нашы дэпутаты, палітыкі зразумелі адзін аднаго, што вельмі важна для паспяховага супрацоўніцтва.

Дэлегацыя міжпарламенцкай групы дружбы «Турцыя – Беларусь» Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі, якую ўзначальваў Рэха Чамураглу, зрабіла ў перыяд з 17 па 20 мая 2010 года візіт у Мінск. Я веру, што ў бліжэйшы час узаемныя візіты прадстаўнікоў такіх груп прадоўжацца.

Нашы краіны супрацоўнічаюць і падтрымліваюць адна адну і на міжнароднай арэне. Я хачу асабліва падкрэсліць, што гэта не спарадычныя праявы, а пастаяннае ўзаемадзеянне.Так, Беларусь падтрымала кандыдатуру Турцыі на часовае членства ў Савеце Бяспекі ААН на перыяд з 2009 па 2010 год, а таксама выказалася за кандыдата, які быў вылучаны Турцыяй на пасаду генеральнага сакратара АБСЕ. Я ганаруся тым, што можна прывесці мноства прыкладаў супрацоўніцтва нашых краін у розных галінах. Напрыклад, рабочую групу па далучэнні Беларусі да Сусветнай арганізацыі гандлю ўзначаліў пастаянны прадстаўнік Турцыі ў гэтай арганізацыі.

**– Вы ўжо некалькі разоў узгадвалі энергічнасць турэцкіх бізнесменаў. Думаю, многія беларусы ўжо сутыкаліся з імі, нават у паўсядзённым жыцці. Як выглядае эканамічны складальнік нашых сувязяў з пункту гледжання пасольства?**



– Тыя поспехі Турцыі і Беларусі ў эканамічнай сферы, якія мы назіраем у апошнія гады, ствараюць добрую аснову для пашырэння супрацоўніцтва ў сферы бізнесу, прамысловасці, гандлю. Сапраўды, аб'ём двухбаковага гандлю ўзрос з 2001 года ў 9 разоў. У 2007 і 2008 гадах назіраўся рост тавараабароту на 60 і 51 % адпаведна. У 2008 годзе аб'ём гандлю дасягнуў 260 мільёнаў долараў, і, нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс, рэзкага скарачэння гандлю не адбылося. У 2010 годзе аб'ём гандлю склаў 340 мільёнаў долараў, а ў 2011 годзе мы з задавальненнем адзначылі, што пераадолелі мяжу 400 мільёнаў долараў. Але відавочна неабходнасць актывізацыі працы ў гэтай галіне.

Мы ў Турцыі сочым за поспехамі нашых беларускіх сяброў, бо ВУП вашай краіны за перыяд двухбаковых адносін вырас з 10 да 60 мільярдаў долараў (па намінале). ВУП Турцыі на сёння перасягнуў 800 мільярдаў долараў, і яна мае штогадовы 400-мільярдны аб'ём знешняга гандлю. Вы бачыце, які магутны патэнцыял у нас для далейшага развіцця ўзаемакарысных эканамічных стасункаў. Дарэчы, аб'ём турэцкіх інвестыцый у Беларусь наблізіўся да 1 мільярда долараў, што дало магчымасць Турцыі ўвайсці ў першую тройку самых буйных інвестараў на тэрыторыі Беларусі.

**– Можаце Вы прывесці прыклады эфектыўных турэцкіх інвестыцый у беларускую эканоміку?**

– Адным з найбуйнейшых капіталаўкладанняў у Беларусі стала купля ў 2008 годзе кампаніяй LIFE Telekom 80 % акцый BEST Telekom і наступныя інвестыцыі, якія дасягнулі за два-тры гады амаль 800 мільёнаў долараў.

Вядомыя ва ўсім свеце турэцкія падрадчыкі, пачынаючы з 1990 года і да сённяшняга дня, ажыццявілі на тэрыторыі Беларусі будаўнічыя работы на агульную суму каля 1 мільярда долараў. Пасля таго як кампанія Emsaş рэстаўрыравала адзін з найбуйнейшых і найбольш вядомых у Беларусі атэляў «Мінск», група кампаній Princess Grubu пабудавала ў Мінску першы пяцізоркавы атэль Crowne Plaza. Мы гана-

рымся тым, што адзін з самых вядомых забаўляльных і дзелавых цэнтраў беларускай сталіцы «Журавінка» таксама быў пабудаваны і дагэтуль эксплуатуецца турэцкай кампаніяй. Акрамя таго, чакаецца, што ў 2012 годзе будзе ўведзена ў эксплуатацыю гасцініца «Прэзідэнт-атэль», будаўніцтва якой ажыццяўляецца кампаніяй Emsaş. Гэта работа турэцкіх фірм таксама робіць важны ўклад у фарміраванне турыстычнай інфраструктуры Рэспублікі Беларусь. Я веру, што дзякуючы новым праектам, якія будуць ажыццёўлены, у Мінску значна ўзрасце колькасць гасцініц вышэйшага ўзроўню.

**– Дзякуючы намаганням пасольстваў абедзвюх краін, урадавых і навучальных устаноў, грамадскіх арганізацый, такіх як «Дыялог Еўразія», якую, дарэчы, добра ведаюць у Беларусі, значна пашырыліся нашы культурныя і адукацыйныя сувязі.**

– Так. У сувязі з тым, што турэцкая мова ў апошнія гады стала адной з самых папулярных замежных моў сярод маладых людзей, што навучаюцца ў беларускіх універсітэтах, па запрашэнні беларускага боку нашы выкладчыкі, накіраваныя Міністэрствам адукацыі Турцыі, працуюць і навучаюць турэцкай мове студэнтаў самых прэстыжных навучальных устаноў Беларусі, сярод якіх Беларускі дзяржаўны, Беларускі дзяржаўны эканамічны, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэты, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Мы задаволены, што на базе двух з гэтых універсітэтаў – БДУ і МДЛУ – былі адкрыты Цэнтры турэцкай мовы і культуры.

Маладыя людзі, якія разам з адной з заходніх моў таксама вывучаюць турэцкую, могуць знайсці працу як у кампаніях, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, так і ў іншых фірмах, якія працуюць у замежных краінах і маюць патрэбу ў спецыялістах з веданнем рускай і турэцкай моў.

Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій, падпісанае ў ліпені 2002 года ў межах Пратакола аб намерах ад 2000 года, а таксама Пратакола аб супрацоўніцтве ад 2005 года паміж НАН Беларусі і ТЮБІТАК (TÜBİTAK), ствараюць спрыяльную глебу для сумеснай працы.



Радуе таксама і тое, што паміж некаторымі арганізацыямі ў рамках ТЮБІТАК і адпаведнымі беларускімі ўстановамі плануецца наладзіць супрацоўніцтва ў даследаванні і распрацоўцы новых тэхналогій. Мы мяркуем, што аб'яднанне некаторых высокаразвітых навуковых галін Беларусі з вытворчай інфраструктурай і кваліфікаванай рабочай сілай Турцыі прынясе карысць абодвум бакам, а таксама дасць магчымасць дасягнуць добрых вынікаў як у навуковай, так і ў эканамічнай сферах.

Вы слушна падкрэслілі, што вялікую ролю ў знаёмстве і збліжэнні народаў абедзвюх краін адыгрываюць культурныя сувязі. Вядома, што ў гэтай галіне ажыццяўляецца значная работа. Асновы гэтых узаемасувязяў былі закладзены дзякуючы Пагадненню аб супрацоўніцтве ад 1995 года і Пратаколу аб супрацоўніцтве ад 2007 года.

Абодва бакі ажыццявілі вялікую колькасць мерапрыемстваў. Так, напрыклад, танцавальны ансамбль «Агонь Анатоліі» наведаў Мінск, балет «Спартак» у пастаноўцы вядомага беларускага дзеяча мастацтваў Валянціна Елізар'ева быў паказаны ў Турцыі, вядомыя выканаўцы Ферхан і Ферзан Андэр далі канцэрт у Мінску, турэцкі оперны спявак Хакан Айсеў выканаў сольную партыю ў Мінску. Тыдзень турэцкага кіно прайшоў у Мінску і Магілёве, у Мінску таксама паспяхова прайшоў канцэрт адной з самых вядомых піяністак Турцыі Ідзіл Бірэт, у Турцыі на конкурсе імя Лейлы Генджэр беларускія выканаўцы занялі першае месца. Полацкі камерны хор даў канцэрт у Анкары, самыя вядомыя танцавальныя і фальклорныя калектывы Беларусі выступілі ў розных гарадах Турцыі і спадабаліся турэцкім гледачам. У 2012 годзе мы сумесна з беларускімі ўладамі плануем ажыццявіць такую ж багатую праграму культурных мерапрыемстваў.

На завяршэнне размовы хацеў бы яшчэ раз падкрэсліць сваё глыбокае перакананне ў тым, што беларускі і турэцкі народы, якія на працягу гісторыі не адчувалі адзін да аднаго варожасці і якія ў многім падобныя, уключаючы пачуццё добразычлівасці і гасціннасці, будуць працягваць сяброўскія адносіны ва ўсіх галінах на аснове ўзаемных інтарэсаў.

**Гутарыў Вадзім ГІГІН**